***Марк Іваненка***

# ЭКАЛОГІЯ ДУШЫ.
# ВЫХАВАННЕ СРОДКАМІ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

Экалогія навакольнага асяроддзя ў XXI стагоддзі відавочна становіцца найпершай па сур'ёзнасці праблемай усяго чалавецтва. Наша цывілізацыя перастане існаваць, калі чалавек не зробіць належных высноў і не памяняе свае адносіны да прыроды. Бо сённяшні стан прыроды – яскравае сведчанне разбуральнай дзейнасці ўрбанізаванага чалавека. Выхад з экалагічнага крызісу трэба пачынаць з выхавання новага чалавека, з экалогіі яго душы, а сам працэс выхавання будаваць на аснове традыцыйнай культуры.

У гэтым складаным працэсе найвялікшую ролю можа адыгрываць вывучэнне традыцыйнай культуры нашага народа. А гэтая культура дае нам вякамі адшліфаваны матэрыял жыццядзейнасці продкаў, якія жылі ў прыродзе і самі з'яўляліся неад'емнай і арганічнай яе часткай. Чалавек ніколі не лічыў сябе царом прыроды, не ўмешваўся ў яе адвечныя працэсы, а разумна і стрымана карыстаўся дарамі зямлі, жывучы ў еднасці і паразуменні з навакольным светам. Праз народную педагогіку, этнаграфію і фальклор чырвонай стужкай праходзяць рэлігійныя, філасофскія, этычныя, агульнакультурныя ўзаемаадносіны чалавека з прыродай. І таму праз этнакультуру ідзе даволі моцнае экалагічнае выхаванне.

«Беларуская этнічная культура развівалася ў прасторы, дзе дамінавалі ідэалы і духоўныя каштоўнасці, якія склаліся пад уплывам Святога Пісання і хрысціянскай традыцыі...» [8,24]. Былыя пакаленні, працуючы на зямлі, добра адчувалі блізкасць Бога. Гэта праходзіць праз шматлікія творы, асабліва абрадавай паэзіі. Так у калядных песнях мы чуем: «Пане – гаспадару, /Ты з Божага дару /Маеш хлеба-солі /І ўсяго даволі... /Вашы дары і Богу яўны, /І людзям слаўны» [7,314-315].

Лепшыя здабыткі народнай педагогікі, міфалогіі, этнаграфіі і фальклору вучаць успрымаць зямлю і расліны, якімі яна шчодра адорвае нас як жывых істот. Дбайна выкарыстоўваць і клапатліва адносіцца да навакольнага свету, быць міласэрнымі да жывёл і птушак, да ўсяго, што мудрасцю сваёй стварыў Бог на радасць чалавеку. Само ўспрыманне свету, як божага, дае асновы ўзаемаадносін з ім і выхоўвае дбайнага гаспадара, які ведае кошт таму, што мае.

Святая ніва, на якой адбываецца вялікі цуд – расце хлеб! Ад яе залежыць жыццё. Да яе прыходзяць як да самага дарагога, яе шануюць, ёй спяваюць шчырыя песні: «Радзі, Божа, жыта /На другое лета. /Радзі, Божа! /На другое лета /Лепшае за гэта. /Радзі, Божа!.. » [6,63]

Дзіўны лес, напоўнены хвалюючай сэрца таямніцай. Без яго цяжка ўявіць беларуса. Ён не толькі забяспечвае чалавека многім неабходным для жыцця, але і хавае яго ад ворагаў, дае яму прытулак і ежу. Таму на самыя вялікія святы прыносяцца ў хату зялёныя галінкі дрэў і з пяшчотай развешваюцца над чырвоным кутам [9,41-44].

Зараз многія вучоныя займаюцца даследаваннем раслін, карысных для здароўя чалавека, але ніхто з іх пакуль не можа пахваліцца, што даследаваў ўсе расліны, якімі карысталіся нашы продкі для лячэння розных хвароб і падтрымання добрага здароўя. Пра паважлівыя, вытанчаныя адносіны беларусаў да расліннага свету сведчаць нам многія песні, казкі, зычанні, прыказкі і прымаўкі. Так у народзе гаварылі: «Чарніцы ад слепяніцы, /Ліпа ад паліпа, /Ад нерваў – боб, /А зверабой – ад ста хвароб!» [2,16]

У Вербную нядзелю, віншуючы са святам, б'юць прынесенай з царквы вярбою і прыгаворваюць: «Не я б'ю, вярба б'е, /Праз тыдзень Вялікдзень... /Не будзь санлівы, да работы лянівы, /А будзь як пчала: і ўработна, і весела. /Расці, як вярба, будзь здароў, як вада, /Май жыццё гожае ва славу Божую!» [2,19]

У вуснай народнай творчасці вельмі часта ўзгадваецца вада. Вада – аснова жыцця. Ёй абмываюць толькі што народжанае дзіцятка і чалавека, які адыходзіць у вечнасць. Да вады прыходзяць паплакаць і парадавацца, ёй давяраюць самыя патаемныя мары дзяўчаты і хлопцы, свае горкія думы ўдавіцы, свае спадзяванні маці. Падчас святога Хрышчэння вада асвячаецца не толькі там, дзе праходзіць набажэнства, але паўсюдна, убіраючы святую гаючую і ачышчальную моц. Хто, якія абставіны заставяць чалавека, які ведае пра гэта, выкінуць смецце ці выліць бруд у раку або возера, тым больш – у крыніцу ці калодзеж.

Галоўным крытэрыем маральнасці ў беларускага народа заўсёды было стаўленне чалавека да працы, яго стараннасць і ўмельства: «Не той харошы, хто знешне прыгожы, а той харошы, хто да справы гожы!»[4,139], «Хто з работай дружыць, той жыве і не тужыць» [1,86].

Праца – ядро народнай педагогікі, грунт сямейнага выхавання. Дзіця з першага дня жыцця, пачынаючы знаёмства з навакольным светам, бачыла, як працуюць бацькі, чула песні, якія суправаджалі іх працу, і разам з малаком маці засвойвала працоўныя традыцыі народа, усведамляла сваё асноўнае месца на зямлі – яно ў працы.

Адна са значных традыцый працоўнага выхавання – навучанне рамяству. У рамках знаёмства з этнакультурай можна навучацца саломапляценню і лозапляценню, ткацтву і вышыўцы, аплікацыі і выцінанцы, многім іншым традыцыйным рамёствам. Уменні ствараць прыгожыя і карысныя рэчы ўласнымі рукамі выхоўваюць любоў да хараства, да родных мясцін і роднага краю, павагу да людзей і да прыроды. Нават нарыхтоўка сыравіны для працы вучыць быць ашчаднымі і дбайнымі гаспадарамі, разумна ставіцца да прыродных багаццяў, клапаціцца аб іх узнаўленні. Адходы такой вытворчасці, будучы экалагічна чыстымі, угнойваюць зямлю, не парушаючы яе натуральных працэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі гаварыць пра экалогію жытла, то беларусы, як і іншыя народы Усходняй Еўропы, стваралі ўтульнае, суразмернае з чалавекам, экалагічна чыстае асяроддзе, усведамляючы дойлідства як частку прыроды. І сапраўды: і хата, і брама, і гаспадарчыя пабудовы, і калодзеж-журавель, і абсталяванне хатняга інтэр'еру – усё было зроблена з дрэва. На драўляных кроснах ткалі палатно, у драўлянай калысцы песталася немаўля, драўлянымі вёдрамі насілі ваду, драўлянымі лыжкамі елі, на драўлянай жалейцы ігралі продкі свой гімн адзінству чалавека і прыроды, міру паміж руплівай працай хлебароба і вечнай прыгажосцю шчодрай зямлі.

Экалогія адзення і харчавання ў традыцыйнай народнай культуры таксама вартыя вывучэння і асэнсавання. Асноўнай сыравінай для вырабу тканіны ў беларусаў з'яўляліся валакністыя расліны і воўна. Адзенне шылася з натуральных матэрыялаў, якія адпавядалі ўсім неабходным патрабаванням з боку здароўя чалавека. Здаўна было вызначана, якое адзенне насіць у будні ці свята, надзяваць на вяселле ці на радзіны, падчас радасці ці жалобы. Матэрыял, мастацкае аздабленне і тэхніка выканання кожнага такога касцюма былі рознымі, але галоўныя характарыстыкі зручнасці і прыдатнасці да таго ці іншага мерапрыемства – аднолькавымі.

Кухня беларусаў цікавая і разнастайная, але самае важнае ў ёй – адпаведнасць здароваму ладу жыцця. Не так даўно вучоныя свету прыйшлі да высновы, што ежа, засмажаная ў алеі, асабліва бульба і збожжавыя, вельмі шкодная для здароўя чалавека. А нашы продкі з вельмі даўніх часоў (без навуковых доследаў!) ведалі законы здаровага харчавання і ніколі не лілі алей на патэльню. Яго патроху сырым дабаўлялі ў ежу, што, дарэчы, вельмі карысна.

Экалогія ўзаемаадносін паміж людзьмі – праблема вартая асаблівай пільнай увагі. Мы вучымся хрысціянскім прынцыпам дабра, спасцігаем адвечныя законы веры, надзеі і любові ў самых высокіх іх сэнсах. Таму і адносіны паміж людзьмі, выхаваныя на той частцы разумнага фальклору, які нясе ў сабе асноўныя ісціны Свяшчэннага Пісання, не супярэчаць евангельскім высновам: «... як хочаце, каб рабілі вам людзі, так і вы рабіце ім... » [5,7:12]. Народная мудрасць вучыць: «Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць.» [1,94], «Бывае свой язык горш за ліхога суседа» [1,94], «Адна пчала многа мёду не наносіць» [1,95], «Дзе дружна, там хлебна» [1,95].

З вялікай павагай ставіліся нашы продкі да свята. Сведчаннем гэтаму словы вясковай жанчыны, якія сцвярджаюць агульнанароднае меркаванне: «Мы далжны рабіць цэлую нядзелю, а ў нядзельку ўжэ далжны аддыхаць і славіць Госпада Бога нашага» [3,15]. Мноства народных святаў праводзілася на прыродзе сярод казачных краявідаў: лугоў і лясоў, рэк і азёр, ручаін і крыніц. Гэта аказвала і аказвае вялікі ўплыў на экалагічнае і эстэтычнае выхаванне чалавека. Дзякуючы народнаму каляндару, які мае асновай гадавы круг царкоўных святаў, жыццё ад нараджэння да смерці напаўнялася таямнічым, высакародным сэнсам і было цікавым і змястоўным. Менавіта адчуванне свята, чаканне яго і ўдзел у ім давалі нашым продкам духоўныя сілы, абуджалі радасныя эмоцыі, стваралі добры настрой і сцвярджалі радасць жыцця[9,47]. Пасля народных гулянняў ніколі не заставалася смецця. Чаму ж тады ў нашы часы гульнёвыя пляцоўкі пераўтвараюцца ў сапраўдныя сметнікі? Напэўна, гэта залежыць і ад выхаванасці чалавека, і ад яго разумовага ўзроўню, і ад іншых складнікаў, але ж найбольш – ад стану душы. Таму і варта ўзгадаць пра экалогію чалавечага духу.

Выхаванне, у аснове якога пакладзены хрысціянскі светапогляд, праз працу, праз святкаванні, праз традыцыі і звычаі, народнай мудрасцю, якой так багаты нашы калыханкі, казкі, песні, прыказкі прымаўкі, народны гумар, прыводзіць чалавека да разумення сваёй еднасці з прыродай і людзьмі, напаўняе яго душу мірам і радасцю, якія потым перадаюцца тым, хто побач і ўсяму навакольнаму свету.

Праз традыцыйную народную культуру для нас больш глыбока і асэнсавана адкрываюцца адвечныя паняцці прыгажосці і гармоніі, якія прымушаюць нас задумацца аб сэнсе нашага часовага жыцця і непадуладнай розуму чалавека Вечнасці, над якой уладарыць сам Бог.

**Спіс літаратуры:**


1. Арлова, Г.П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г.П. Арлова. – Мінск : ГВЗАТ «Маладняк», 1995. – 160 с.
2. Асабісты архіў Іваненкі М.М. (Запісана ў 1998 годзе ад Высоцкай Л.І. з вёскі Багданава Вілейскага раёна).
3. Беларуская «народная Біблія» ў сучасных запісах / уступ. артыкул, уклад. і камент. А.М. Боганевай. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – 166 с.
4. Беларусы. Т.5 Сям'я / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак і інш.; рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш.; Інст. мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 534 с.
5. Евангелле паводле Матфея.
6. Жніўныя песні / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 816 с.
7. Земляробчы каляндар : Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага; успуп. арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 429 с.
8. Конан, У.М. Біблейскія і хрысціянскія матывы ў беларускай этнічнай культуры/ У.М. Конан. – Погляд у вечнасць : зб. артыкулаў да 75-годдзя Ул. Конана / укл. М. Козенка. – Мінск : Фонд культуры, 2009. – С. 23-34.
9. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў сродкамі народнай педагогікі (з вопыту работы этнашкол Мінск. вобл.): вучэб.- метад. дапам. / склад. М.У. Грудзінскі, А.С. Вярынская; УА «Мінскі дзярж. абл. ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхт. кадраў». – Мінск, 2008. – 110 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ